# АНДРЭЙ ВАШКЕВІЧ.
# ЦІ МЕЛА КАЛОЖСКАЯ ЦАРКВА ВЕЖУ-ЗВАННІЦУ?

*Крыніца друкавання:*

**Вашкевіч, А. Ці мела Каложская царква вежу-званніцу? [Электронны рэсурс] / Андрэй Вашкевіч // Harodnia.com. – Рэжым доступу: https://harodnia.com/be/uczora/starazhytny-horadzien/590-tsi-mela-kalozhskaya-tsarkva-vezhu-zvannitsu. – Дата доступу: 29.06.2017 г.**

Пачынаючы з другой паловы XIX ст. археолагі, гісторыкі і архітэктары стварылі каля дзясятка розных варыянтаў магчымага першапачатковага выгляду старажытнай Барысаглебскай царквы ў Гродне.

Усе гэтыя варыянты маюць некаторыя агульныя рысы, але наогул вельмі моцна адрозніваюцца адзін ад другога. І гэта зразумела – нават першыя выявы царквы на гравюрах другой паловы XVI ст. ужо паказваюць нам храм, які страціў свой пачатковы выгляд за чатыры стагоддзі існавання. У дадатак да ўсяго ў сярэдзіне XIX ст. храм настолькі моцна разбурыўся, што мы страцілі магчымасць нават даследаваць гісторыю перабудоваў паўднёвай і часткі заходняй сцяны будынка, а таксама раскапаць ягоныя падмуркі ў гэтым месцы. Ацалела толькі некалькі малюнкаў Каложскай царквы, зробленых незадоўга да разбурэння. Усе яны, калі паглядзець на заходні фасад храма, адлюстроўваюць адну вельмі цікавую акалічнасць – гэты фасад царквы быў не сіметрычны. З правага боку (калі стаць тварам да храма) добра відаць вельмі шырокую, нехарактэрную для царквы лапатку. З левага ж боку лапатка звычайная, вузкая, такая самая як і на іншых сценах Каложы. З даследчыкаў, якія спрабавалі аднавіць выгляд храма, на гэтую акалічнасць звянуў увагу, здаецца, толькі Ул. Бачкоў, які на сваёй рэканструкцыі прадоўжыў гэтую лапатку-плоскаць невялікай плоскай вежачкай, якая “вырастае” са сцяны. Такія “плоскія” званніцы характэрныя для пскоўскай архітэктуры, на такую званніцу нельга было ўзлезці, званар стаяў на зямлі.



**Выгляд Каложы па версіі Ул. Бачкова**

Аднак, на наш погляд, канцэпцыю Ул. Бачкова можна істотна дапоўніць. І зрабіць гэта можна з увагі на некалькі фактаў. Прыгледзімся да малюнкаў храма напярэдадні разбурэння. Фасад царквы досыць густа пакрыты маёлікавымі крыжамі, адзін крыж бачны і на захаванай дасюль вузкай лапатцы фасада. А вось на шырокай знішчанай праз нейкі час паводкам частцы сцяны нябачна ніводнага крыжа, толькі камяні, ды і тое нейкія дробныя, размешчаныя зусім хаатычна.






Чаму ж такая вялікая частка галоўнага фасада храма, не была ўпрыгожана крыжамі? Мы, на жаль, ужо ніколі не зможам даследаваць гэтую сцяну, яе будаўнічы матэрыял і гісторыю, аднак цалкам можна дапусціць, што шырокая лапатка ў XII ст. не была знешняй сценкай царквы. Гэта была ўнутраная сцяна чатырохкутнай вежы-званніцы, якая моцна выступала з аб’ёму царквы. Такому дапушчэнню ёсць яшчэ адзін доказ – падмурак храма ў Ваўкавыску, які цалкам справядліва адносяць да гродзенскай архітэктурнай школы. Гэты падмурак акурат быў закладзены з разлікам на тое, што храм будзе мець такую званніцу. Несіметрычнасць галоўнага фасада царквы на Каложы – доказ таму, што і наша гродзенская царква мела такую званніцу, а ваўкавыскі храм з’яўляецца найбліжэйшым “сваяком” Каложы. Можа нават больш блізкім, чым Ніжняя Царква на Замкавай гары.

**Андрэй Вашкевіч**

